

# Цярэшку зноў жанілі!





*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета ў Велеўшчыне «Жаніцьба Цярэшкі» праводзілася дваццаць шосты раз. Калі быць дакладнымі, дык менавіта 1995 год стаў пунктам адліку вяртання народнага каляднага ігрышча ў вясковае асяроддзе, туды, дзе яно існавала спрадвеку. Толькі мінулы год стаў выключэннем, а прычына ўсім вядомая — каранавірус. Але гэтым разам клуб-бібліятэка чакаў нямала гасцей. І найпершай госцяй сярод запрошаных была Валянціна Крыцкая з суседняй вёскі Аношкі: жанчына доўгі час была завадатаркай ігрышча, з яе, так бы мовіць, лёгкай рукі і пачаўся новы этап існавання «Цярэшкі». Мне некалькі разоў даводзілася здымаць вечарынкі, на якіх Валянціна Іванаўна была ў ролі «маці», яна «перакручвала», гэта значыць сватала пары. Да таго ж яна ўмее спяваць прыпеўкі-цярэшкі і ведае іх процьму — каго хочаш за пояс заткне. Ахвотніца патанцаваць і напрыдумляць «прышпільных» конкурсаў.

Але гэтым разам на клубнай падлозе гаспадарылі настаўніца-філолаг з вёскі Слабада Наталля Міранович і вядомы на Лепельшчыне дудар і гаспадар аграсядзібы з вёскі Вялікі Поўсвіж Васіль Шкіндзер. У клуб «патусіць» сабралася не толькі тутэйшая моладзь — і з суседніх вёсак зазірнулі рабяты, да таго ж прыехалі ахвотныя з Барысава, Оршы, нават са сталіцы. Капэла музыкантаў гурта «Варган» прыбыла са старажытнага Полацка. Жывы гук! Полькі, кракавяк, падыспань, танец «бабыль» і рытуальны танец «Цярэшкі» — «Лявоніха» не давалі спакою нагам. А яшчэ хуткія і пацешныя гульні «Вішанька», «Пацалункі», «Ручаёк» дадалі жартаў і смеху. Але смех смехам, ды «Жаніцьба Цярэшкі» — гульня ўсё-ткі сур'ёзная. Дзесяць гадоў таму ў Велеўшчыне на «Цярэшку» з'явілася маладая пара, якая пазней стала сапраўднай сям'ёй. Сярод прысутных гэтым разам былі і яны — сям'я Матэльскіх.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
**Больш фота на zviazda.by.**



